離騷

«Лісао» (Лі Сао)

离骚

чуская песьня

劳商

Туга растаньня

Цюй Юань

"Красу, хто шукае,
Той знойдзе сябе."

1
У года сёмы дзень
На сьвет з'явіўся я,
Пяшчотаю бацькоў
Асьвечаны зраньня,
Нашчадак імператара
Чжуаня,
Сын мудрага Ба Юна,
Што мне даў імя
Чжэн-дзэ -
Душы гармонія.
2
Адораны
Шчасьлівым лёсам,
Сябе з дзяцінства
Я аздабляў,
Як мог -
Са шпажніку і архідэй,
І далікатнай павілікі
Я плёў сабе вянок..
3
Я жыць сьпяшаў,
Як быццам бы за мною
Ішла пагібель
Змрочнаю сьцяною -
І я зрываў
Магноліі вясною,
Збіраў суман
Увосень і зімою.
4
За ноччу дзень
Змяняецца няспынна,
Ад восені
Нядоўга да вясны
І не навек
Знікае квет расьлінны,
Але уладара дні -
Злічаны.
5
Трымайся ж,
Мілы сябра!
Не падавайся звадзе,
Не бойся,
Калі трэба,
На новы шлях звярнуць.
Шукай сваю дарогу,
Сачы мае пазнакі,
Быць верным ім
Старайся
І не бяспомным
Будзь.
6
Трох імператараў
Сумленьне
Было аховаю
Красы жыцця -
У коле красак
Размаітых
Квітнела дабрыня .
Там не плялі вянкоў
Са злога
Бадыльля.
7
І веліч Яо,
І слава Шуня
Дагэтуль захаваны
Дасёньня непарушны,
А вось тыраны -
І Цзэ, і Чжоу
Яшчэ да сьмерці,
Ганьбою пакараны.
8
Ды чынавенства
Ўзамен раскошы
Збыло сумленьне
І разам
Здольнасьць
Бяду прадбачыць.
Я не пра тое кажу,
Што страціў -
Боль за Радзіму
Пячэ агнём.
9
Жыцьцё аддаць
Радзіме рады,
Я ні хвіліны
Не жыў са здрадай,
Але ўладар
Паддаўся звадам -
Паклёпу злому
Дазволіў панаваць.
10
Вядома ўсім,
Што моц патрэбна,
Каб горыч праўды
Слухаць і казаць..
Ды кроіць сэрца
Несправядлівасьць,
Гняце няміласьць,
Што пасьпеў зазнаць,
Калі свайму
Змяніўшы слову
Яго пакінуць
Мне загадаў
Уладар.
11
Выгнаньня шлях
Заўсёды горкі,
Ды я адолею
Яго цяжар.
На пустках
Уздыму дубровы
І архідэй
Я пасаджу сто му,
Хай узрастаюць
Лекарскія травы-
Бальзам гаючы
Розуму
Майму.
12
Я мару бачыць
Абшар у квеце -
І сад,
І тое,
Што там
Узрасло.
Не аб маім
Ідзе размова
Леце -
Шкадую страты
Створанага
Мной.
13
Ды ладзіць баль
Узбагачэньня прага.
Дзе злосьцю зайздрай
Кожны апантан,
Свая віна
Здаецца
Незаўважнай,
Віна другіх -
Памерам бервяна.
14
Суперніцтва вакол
І лізаблюдства,
Але не гэта
Кроіць сэрца
Мне..
Здаецца, усё ж,
Найгоршым
Пакараньнем -
Забытым быць
У роднай
Старане.
15
Я п'ю расу
З гарлачыкаў
Магнолій,
Пялёсткі ем
Бялюткіх
Хрызантэм.
Мужчынскай сілы
І цьвёрдай волі
Жадаю я
І беднасць
Не палохае
Мяне.
16
Я ладжу
Абгароды строі -
Лістам і кветкам,
Каб апораю былі,
Каб з роўным станам
Вырасла касія,
Трава духмяная
Тулілася
Да іх.
17
Я жыў,
Як мудрыя
Мяне вучылі
Людзі,
І гэту мудрасьць
Не прыняў
Вакольны сьвет.
Няхай сучасьнікі
Мяне асудзяць,
А я Пэн Сяня
Слаўлю
Запавет!
18
Мне цяжка дыхаць,
Слёзы точаць
Вочы.
Народу я прынёс
У дар
Сваё жыцьцё.
Ды што я з раніцы
Рабіў да ночы
Знішчала заўтра
Зноўку ўсё.
19
Вянок мой
Разарваны,
Але ж, здыханы,
Другім вянком
Я замяню яго -
Я дзевяць раз памру
Без пакаяньня -
Законы праўды
Найвышэй
Ўсяго!
20
Не мае
Годнасьці
Той уладар,
Што не спазнаў
Народа
Вольны дух.
Што ж,
Хай натоўп
Прыблудаў розных
Выносіць мне
Прысуд.
21
Няздарнасьць
З хітрасьцю
Заўжды імкнуцца
Зліцца -
Ў хаўрус ідуць,
Каб разам нішчыць
Законы дабрыні..
Хлусьня
Дзеля карысьці -
Вось закон
Прыблуд.
22
Гняце душу
Расчараваньне
І адзінота
Пячэ агнём.
Сьмерць на чужбіне
Лепш,
Чым слабасьць
І маўчаньне.
З тыранам згода -
Для душы -
Разлом.
23
Не сябра сокал
Вароне шэрай
Па-над прасторам
Гор і далін.
Квадрат і кола
Несумяшчальны.
Няма двух Дао -
У кожнага
Ёсьць светлы шлях
Адзін.
24
І я стрымаю
Свае пачуцьці,
Мяне не зломяць
Ганьба і навет.
Навуку маю
З сабою жыць
У згодзе -
Пра гэта кажа
Мудрых
Запавет.
25
Ды не кідаюць
Мяне сумненьні -
Вярнуцца,
Або рухацца далей?
Здаецца нават,
Што заблудзіўся
Мой конь
У гэтай
Старане.
26
Дык хай жа ён
Спачне на волі
Крыху
Сярод травы
І архідэй.
Навошта нам
Сьпяшаць?
Выпрабаваньняў
Не унікнуць.
Займуся ж строямі
Сваймі
Хутчэй.
27
Красою ззяе
З лотаці адзеньне.
Твару яго
З магнолій і лілей..
Сябе не пазнаю -
У захапленьні
Душа шчаслівай
Сустракае
Дзень.
28
На галаве
Высокая карона
І пасам залатым
Абгорнуты мой стан,
І адчуваю я
Раскошу чысціні,
Калі жывуць у згодзе
Памкненьні
І душа.
29
Увесь вакольны сьвет
Я позіркам абняў бы:
У творчасьці сваёй
Яго увагі прагну.
Жадае услаўленьня
Убор цудоўны мой -
Ён варты бляску воч,
Захопленых
Красой.
30
У кожнага свая
Крыніца асалоды
Я ведаю зраньня
Натхненьне ад аздобы
Здаецца несумненным,
Што на краі жыцьця
Такому захапленьню
Пакіну вернасьць
Я.
31
Разумніца Нюй-сюй,
Вяршыня дабрыні,
Сястра мая
Казала мне,
Што праўды
Не баяўся Гунь,
Хоць вельмі сціплым
Быў
І толькі выпадак
Яго згубіў.
32
А я, маўляў,
Хоць праўды не бягу,
Занадта вытанчаны
Густ,
Пры гэтым, маю -
Калючкі злыя
Атачылі двор -
Праз іх іду -
Як бы
Не заўважаю.
33
Усім жа
Не раскажаш
Пра сэрца
Таямніцы,
Бо толькі добры сябра
Сягае ў глыбіню.
Сяброўства -
Гэта шчасьце,
А ты мяне
Не чуеш,
Не хочаш супакоіць
Прыхільніцу
Сваю.
34
Сястрыцы маёй любай
Я так сказаць магу:
"Жыў згодна запаветам,
Але спазнаў тугу.
Пайду цяпер
На поўдзень
Уздоўж цячэньня Сян,
Каб Чжун-хуа
Данесьці
Гісторыю
Жыцьця.
35.
Дало паэту неба
Мэлёдыі напеваў
З традыцыі дынастый,
З гісторыі вякоў -
Каб ведалі
Нашчадкі,
Стварыў ён
Дзевяць песень
Пра лёс
Уладароў.
36.
Вось Хоу І -
Што ведаў ён
Ад раньня
Да світанку ?
Упаляваў
Усіх лісіц
З ваколіц,
А сам быў забіты
Жонкі каханкам.
37.
Не мінула
Расплата
Тых,
Хто здрадай
Захопвалі уладу.
Чакаў іх жорсткі лёс -
Гвалтоўнай смерці
Жах
Спазнаць
Ім вырак неба
Нёс.
38
Быў злом Ся Цзэ -
Ён скончыў
Самагубствам.
Апошнім з Інь
Быў Чжоу-ван,
Што загадаў
Змалоць усіх
Прыдворных
І так праславіўся,
Як жудасны
Тыран.
39
І быў суворы Юй,
Ды правіў
Справядліва.
Таксама Чжоу
Не рабіў памылак -
Ён тым,
Хто славілі дабро,
Быў рады,
Заўжды адпрэчваў
Зло
З пагардай.
40
Ах, неба,
Існасьці вышэйшае
Зарука!
Мы ад цябе нічога
Не здольныя
Схаваць.
Усім ты дапаможаш,
Хто змог у чысціні
Сваю душу
Ўтрымаць.
41
Упарта у мінулым
Шукаю знакі праўды.
Магу зрабіць
Выснову,
Што спеласьць
Мне дала:
Той,
Хто дабра не робіць,
Не мае абавязкаў,
Ніколі той не знойдзе
Зваротнага
Цяпла.
42
І нават, калі сьмерці
Мяне крыло кранае,
Кажу я праўду сьмела,
Каб гонар не згубіць:
Сумленным і праўдзівым
Заўжды чакаць
Ганеньняў,
Але ж яны
Не могуць
Па-іншаму
Пражыць.
43
У скрусе я,
Бо правіць намі
Карысьці і хлусьні,
І подласьці хаўрус.
Ад болю сьлёзы
Льюцца
За кветкамі
Я іх хаваю,
А вочы
Сьлёзы
Льюць.
44
Я сьвету распавесьці
Хацеў пра ўсе
Трывогі
Праўдзівае душы,
Закрыўшы шлях
Хлусьне.
І насьцеж у нябёсы
Расчыняцца дарогі,
Дракон і фенікс
Узнясуць
Мяне.
45
Калі зямлю,
Дзе пахаваны Шунь,
Пакінуў я у раньні
І дасягнуў гары
Сьвятой Сяньпу,
Хавалася
Ўжо сонца
За гор ланцуг.
46
Я загадаў Сі-хэ,
Вазніцы сонца,
Каб да пячоры
Ён запаволіў
Лёт -
Агледзецца мне
Трэба
Бо шлях мой
Невядомы
І лёс пакуль
Не вызначаным
Ёсьць.
47
Я напаіў дракона
У возеры Сянчы,
Дзе ранак кожны
Сонца мые вочы,
Хаваецца яно
За дзеравам Фусан
І да яго я
Лейцы прывязаў.
Прасторам небасхілу
Вядуць мае дарогі
І белыя аблокі
Мне сьцелюцца
Пад ногі.
48
Вазьніца месяца,
Магутны Фенікс
Нясе мяне
Угору,
Фэнь-лянь,
Бог ветру,
За плячыма,
А птушка мудрасьці,
Луаньхуан,
Паказвае дарогу..

49
Ляці ж, мой Фенікс,
І ўдзень, і ўночы!
Хай бура за сьпіной
Раве, грукоча
І гоніць хмары,
Хай сонца блішча,
Аблокаў горы
Няхай вітаюць
Нас!
50
У бляску сонца
Мы прыляцелі
Да неба царства
Заву я стражу,
Каб адчынілі дзьверы
Ды змрочны стражнік
Не глянуў нават
На мяне
І тым
Зняважыў..
51
Злавесная
Упала раптам
Цемра,
Стаю у адзіноце
І вырак-стогн
З грудзей ірвецца:
Ні на хвіліну
Сьвет не будзе
Чыстым -
Заўжды
Заганны ён!
52
І нават, калі заўтра,
Я несьмяротным стану,
Міну раку Байфэй
І стрэну там
Сьвітанак,
І на Лянфыне нават,
Мне сэрца
Жаль пратне:
Там справядлівасьці
Няма таксама,
Не.
53
Але палац вясны
Чуньгун
Красуе зеляніны
Зьзяньнем.
Галінку з дрэва Цюн
Сарву -
Знак вечнага
Каханьня.
Абранніцы сваёй
Я падару яе,
Каб сьвежасьці
Не страціла
Ў чаканьні.
54
Няхай бог перуноў
На хмары
Праімчыць,
Сустрэне ён Мі-фэй
Ля казачнай ракі,
Падорыць ёй вянок,
Майго
Прызнаньня
Папросіць
Для мяне
Яе рукі.
55
Мі-фэй спачатку,
Мо, была не супраць,
Але затым
Адмовіла
У прапанове
Мне -
Рака Лошуй
Яе спатоліць сэрца
І боствам водаў
Назаве.
56
Сваёю прыгажосьцю
Захоплена была
Мі-фэй,
Хацела выставіць
На сьмех мяне,
Таму забуду я
Красу яе.
57
З нябёс гляджу -
Які цудоўны сьвет
Ляжыць
Перада мною!
Сыходжу на зямлю
І ў полымі зары
Я бачу на тэрасе
Чароўную красуню -
Юсунскую
Цзян Дзы.
58
Я загадаў,
Каб вып
Была мне свацьцяй,
Яна ж сказала:
"Не дуры мне
Галаву",
А голуба здаўна
Лічыў я недалёкім
Яго ў сваты
Не пазаву.
59
Трывогаю да краю
Сэрца поўна -
Я сам пайду прасіць
Яе рукі...
Раней мяне
Зляцела птушка
З неба -
Паслаў яе
Магутны
Гао Сін.
60
Ізноў туга
Душу халодзіць.
Яе адпрэчу -
Помню вунь -
Сам Шао Кан
Быў без прытулку -
Красы не ведаў
Юйскіх
Прыгажунь.
61
Мой сват дурны,
Не лепей свацьця.
Куды не глянь -
Наўкол няўдача.
Ізноў кажу:
Той брудны сьвет,
Дзе праўду губяць
І злому
дзячаць.
62
Далёка Уладар -
Тугі маёй
Ён не спазнаў,
Хоць мудрасьць
Меў.
Мае дакоры
І папрокі
З сучасьнікаў
Ніхто
Не зразумеў…

63
Красак чырвоных
Зьбяру я букет -
Гаданьне, мо,
Лекамі
Стане журбе?
І вось, што сказала
Гадалка Лінь-фэнь:
"Красу, хто шукае,
Той знойдзе
Сябе."
64
Край наш вялікі,
Гор і далін ,
Яго, як спазнаеш,
Не будзеш адзін.
Тая душа,
Што красою жыве,
Сэрца адчыніць
Адразу табе.
65
Духмянай травою
Поўніцца край -
Навошта шукаеш
Ты страчаны рай?
Шчасьця мінулага
Скончыўся час -
Новы прастор
Апаноўвае нас.
66
Розныя людзі
Жывуць у краіне -
Любоў і пагарда
Розныя ў іх.
Нізкія мкнуцца
Найвышай узняцца -
Быццам бур'яна
Растуць
Бадылі.
67
Не разумеюць
Яны прыгажосьці,
Не ўсьведамляюць
Красы архідэй.
Яны не ацэняць
Вады дыямента.
Будзе заўсёды
Такім
Сьвет людзей"
68
Я выканаць рады
Разумных парады,
Ды нешта трымае
Рашучасьць маю.
Яшчэ запытаю -
У-сян чараўніца
Спускаецца ў ночы
З нябёс
На зямлю.
69
Я перац і рыс
Ёй прыгатую,
Парады яе
Таксама пачую.
Месяца сьвет
Срэбрам ліцца,
Голас у ночы
Шэптам
Здаецца:
70
"Сапраўдных сяброў
Ты павінен шукаць
Усюды, дзе шлях твой
Будзе ляжаць.
Уладароў
Прыклады маем -
Мудрасьці свет
Іх пазначае.
71
Так і ў каханьні -
Сам ты павінен
Усё вырашаць
Без перасыльных.
Катаржнік стаў
Першым дарадцам,
Князю апорай
І ратаванцам.
72
Аж у семдзесят год
Палкаводзец адзін
Шлях перакрыў
Для дынастыі Інь.
Ну а песні Нін Цы,
Слаўныя ладам,
Узнялі пастуха
Да высокай
Пасады.
73
Жыць не баяцца,
Раджу табе я,
Бо хутка настане
Захад жыцьця -
Зязюлі куваньне
Зусім нечакана
Знішчыць духмяны
Водар у траў.
74
Ты проста чароўны
У гэтым адзеньні!
Высакродны
Маеш убор -
Толькі баюся,
Што недарэкі
Такой прыгажосці
Зладзяць
Адпор.
75
Так, безумоўна,
Час сплывае,
Пакуль ля брамы
Я чакаю -
Губляе водар архідэя
І шпажнік пырнікам
Стае.
76
Чаму о, Богі,
Над далінай
Ужо лунае дух палыну -
У горычы й журбе?
Якое зло
Таму прычынай,
Акром таго,
Што не люблю
Сябе?
77
Дружбай дарыла
Мяне"Архідэя",
Апораю царства
Здавалася мне.
Час праляцеў -
І я болей не веру -
Той прыгажосьці,
Што служыць хлусьне.
78
"Перац"ільсьцівы,
А прагне улады -
Грубым і наглым
Сябе паказаў,
Але, пры тым,
Намагаецца славы.
Здраднік жа сам
І ў смуродзе
Прапаў.
79
Вось рэкі гнуцца
Нібы лукі,
Дарогу прабіваючы
Сярод далін.
Сачу за імі
Са здзіўленьнем -
Што ж тут казаць
Пра сьвет
Расьлін?
80
Мне дарагі вянок,
Што успаміны
Занатаваў
Жыцьця
Майго.
Ён захаваў
Яшчэ свой водар,
Бо цяжка
Выветрыць
Яго.
81
Пайду шукаць
Сабе сяброўку,
Каб разам жыць
І ў шчасьці, і ў журбе
Пакуль вянок духмяны -
Сэрца просіць
Натхненьня
Для сябе.
82
Пра мой,
Хоць лёзны,
Але слаўны лёс
Абвесціла Лінь-фэнь:
Адораны я знакам
Несьмяротнасьці
І яшма -
Замест ежы
Мне.
83
Дракона ў калясніцу
Запрэгла чараўніца -
Трывожная душа
У пошуку імкне -
Няведамая даль
Чакае зноў
Мяне.
84
На горы Куэньлун
Лячу -
Пабачыць сьвет
З вяршынь
Хачу
І вось званочак
Спадарожніцы
Завоблачных
Вандровак
Чую.
85
Адкрытым стаўся
Шлях да зор
І мы ляцім
У весь
Апор.
Шаўковы сцяг
Трымае
Фенікс.
Не мае роўных нам
Прастор.
86
Ды вось паходу
Пустыня ўзнікла
Перашкодай.
Рака наўзбоч
Імчыць
Чырвоная -
І мостам стаць
Прашу дракона
Я.
87
Прыйшоў затым
Прывалу
Час.
Нялёгкі шлях
Чакае нас -
Праз скалаў лес
Ляжыць дарога
Да мора захаду
Вядзе
Яна.
88
Ўсе тысячу
Сабраныя,
З нэфрыту, калясніцы.
Аблокамі над імі -
Сонм сьцягоў.
У кожнай з іх -
Па восем коней -
Напругаю гарачь,
Нібы,
Драконы.
89
Магутны рух
Спыніў я
Крыху,
Ды не стрымаў
Натхненьня -
Стварыў я
Дзевяць
Песень
І напеваў
У творчым
Захапленьні.
90
І вось гатовы
Імкнуць у неба,
Зірнуў уніз -
Радзімы бачу сьвет...
Тугою раптам
Занялося сэрца..
Мой конь застыў
І не ідзе
Далей.

ЭПІЛОГ

Ўсяму канец!
Дары мае
Не прыняла
Айчына,
Не зразумелі
Людзі.
Нашто аб гэтым
Плачу я?
Хай прыкладам
Мне лёс Пэн Сяня
Будзе.

屈原

Цюй Юань

(бл. 340 — † 278 до н. э..)

Туга растаньня

Пераклад зроблены А. Самахвал на аснове перакладаў А. Ахматавай, А. Гітовіча і А. Баліна

Кто ищет красоту, тебя найдет.
(А. А. Ахматова)

И та,которой
Красота понятна,
Тебя поймет -
Таким, каков ты есть.
(А.И.Гитович)

Кто ищет красу - повстречает ее на пути.
(А.И.Балин)

ПІНСК 2015